ВікіпедыЯ
Свабодная энцыклапедыя

Вольга Славаміраўна Бондарава

Звязаць?
З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Вольга Славаміраўна Бондарава

Дата нараджэння	20 кастрычніка 1982 (40 гадоў)
Грамадзянства	Беларусь
Партыя	Камуністычная партыя Беларусі

Вольга Славаміраўна Бондарава (нар. 20 кастрычніка 1982) — прарэжымная і прарасійская актывістка з Гродна. Стала вядомай падчас паслявыбарчых пратэстаў у Беларусі 2020 года. Вядзе Telegram-канал «Бондарева. БЕЗ КУПЮР», агрэгатар прапагандысцкай інфармацыі і ўласных меркаванняў. Праз канал збірае подпісы аднадумцаў у падтрымку сваіх зваротаў. Выказванні Бондаравай і яе звароты рэгулярна становяцца прычынай спынення мерапрыемстваў, скасавання ініцыятыў і кантрактаў. СМІ называюць Бондараву «галоўнай даносчыцай краіны»[1].

Біяграфія

Імаверна, выхоўвалася без бацькі, пра гэта гаварылі прысутныя падчас аднаго з судовых пасяджэнняў[2].

Большасць часу нідзе афіцыйна не працавала. У 2018 годзе непрацяглы час была на невядомай пасадзе ў штаце кампаніі «Чысты свет плюс». Астатні час Бондарава ў дзяржаўных базах даных, паводле інфармацыі «Кіберпартызан», пазначана як «беспрацоўная»[3].

Прыцягвалася да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці за кантрабанду цыгарэт у Польшчу[4].

Не пазней за 2021 год уступіла ў Камуністычную партыю Беларусі. На старонках партыйнай газеты «Коммунист Беларуси» Бондараву называлі спецыялістам аддзела гістарычнага аналізу Цэнтра вывучэння перспектыў інтэграцыі ЕАЭС (2021)[5], выканаўцай абавязкаў сакратара па агульных пытаннях Мінскага гаркама КПБ і адказным сакратаром рэдакцыі (2023[6]). У красавіку 2023 года была ўзнагароджана медалём ЦК КПБ[7].

У 2022 годзе паступіла ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. Вучыцца на бюджэце на дзённым аддзяленні філалагічнага факультэта, спецыяльнасць — «Беларуская мова і літаратура»[8].

Станам на красавік 2023 года разведзена. Мае дачку. Былы муж працаваў дальнабойшчыкам у Германіі[3], таксама падтрымліваў Лукашэнку, праз што меў праблемы з калегамі-беларусамі[1].

Грамадская актыўнасць

Пратэсты 2020 года ў Беларусі

У 2020 годзе ў самы разгар масавых акцый пратэсту Вольга Бондарава разам з былым супрацоўнікам спецслужбаў Дзмітрыем Бяляковым заснавала ініцыятыву «Інфаспецназ Беларусь», якая супрацьстаяла інфармацыі з незалежных каналаў[3].

Праводзіла акцыю «Антывандал», узгодненую з «органамі правапарадку». Сутнасць акцыі, па словах Вольгі, «у ліквідацыі сімволікі дэструктыўнага зместу, якая нясе антыдзяржаўны сэнс». У практыцы гэта азначала, што Бондарава з аднадумцамі зрэзвала бел-чырвона-белыя стужкі і зафарбоўвала бел-чырвона-белую сімволіку на вуліцах Гродна. Гэта стала прычынай некалькіх канфліктаў з прыхільнікамі перамен, што вылілася ў шэраг судовых працэсаў.

Уступіла ў Саюз блогераў Беларусі, з якога яе выключылі ў ліпені 2021 года за «парушэнне прафесійнай этыкі»[9].

Пацярпелая ў судах

Вольга праходзіла пацярпелай па справе Васіля Пільца[4], якога абвінавацілі ў хуліганстве і асудзілі на «хімію». 14 снежня 2020 года на вул. Агінскага ў Гродне Пілец быццам бы «схапіў яе за шыю левай рукой, здушваючы, прыцягнуў да сябе, затым зацiснуў, здушваючы шыю, паміж плячом і перадплеччам правай рукі, тым самым прычыніў фізічны боль і маральныя пакуты». Па словах Вольгі, яна адчула пачуццё знявагі, страх за сваё жыццё і здароўе.

Васіль Пілец казаў, што выйшаў на шпацыр з сынам і з сабакам. Сабака пацягнула дзіця, тое ўпала на пешаходную дарожку і запэцкалася ў фарбе, якой карысталася Бондарава для замалёўвання надпісаў, што ёй не падабаліся. Пілец зрабіў Бондаравай заўвагу, а тая пачала здымаць яго на мабільны тэлефон[4].

З гэтага пачаўся канфлікт, які скончыўся ў судзе, дзе Бондарава спагнала з Пільца матэрыяльную кампенсацыю маральных пакут — 1000 рублёў. 12 лютага 2021 года суд Кастрычніцкага раёна Гродна прысудзіў Васілю Пільцу год «хатняй хіміі» па ч. 1 арт. 339 КК «Хуліганства». Пазней Гродзенскі абласны суд замяніў «хатнюю хімію» на рэальную[2].

Па тым жа артыкуле з удзелам Бондаравай асудзілі на паўтара года калоніі Вадзіма Плаўскага[10]. У мясцовым скверы ён развешваў белыя стужкі, калі да яго падышла Бондарава і пачала здымаць на тэлефон. Адбыўся канфлікт, у выніку якога мужчыну асудзілі. Плаўскі адбываў тэрмін у ПК № 15 і 17 студзеня 2022 года выйшаў на волю.

Вольга Бондарава фігуравала таксама ў справе аб «штрафе за гномікa[11]» — звярнулася ў міліцыю па факце «пратэстнага дэкору» ў кватэры сваёй былой аднакласніцы.

Актывісцкая дзейнасць пасля заканчэння вулічных пратэстаў

У Вольгі сваё бачанне свету: яна змагаецца супраць беларускасці, у якой бачыць уцісканне рускамоўных у Беларусі, а таксама супраць заходняй моды і праяў заходняга ладу жыцця. Таксама хвалюецца за разбэшчванне моладзі.

Змаганне з заходнім уплывам

Дзякуючы актыўнасці Бондаравай у Беларусі ў 2022 годзе забаранілі святкаваць Хэлоўін[12].

Па яе ініцыятыве ў снежні 2022-студзені 2023 у Гродне адмянілі паказы навагодняга дзіцячага спектакля «Монстры на навагодніх канікулах».

З яе падачы з дзяржаўнага тэлебачання знялі сацыяльную рэкламу супраць гвалту над дзецьмі, якую спансіравала амерыканская арганізацыя USAID. Пасля скаргаў Бондаравай КДК пачаў правяраць пункты продажу цацкі «Хагі-Вагі», якую яна называла праявай сатанізму. Таксама скардзілася на кандытарскую, якая прадавала пірожныя ў форме мужчынскіх і жаночых палавых органаў[3].

Знайшла ў рэкламе бонсцікаў ад «Еўраопта» прапаганду ЛГБТ[13]. Пазней палічыла такой самай прапагандай выяву блогера Дзім Дзімыча ў іншай рэкламе «Еўраопта». У выніку сетка прыбрала рэкламы, якія не спадабаліся Бондаравай[14].

Змаганне супраць беларускасці

Менавіта Бондарава данесла на выстаўлены ў прасторы «Цэнтр гарадскога жыцця» ў Гродне партрэт беларускага антысавецкага партызана Яўгена Жыхара аўтарства Алеся Пушкіна. Пасля гэтага генпракуратура распачала крымінальную справу за «*рэабілітацыю і апраўданне нацызму*». Прастору ліквідавалі[15], а мастака Алеся Пушкіна асудзілі[16] на пяць гадоў пазбаўлення волі. У ліпені 2023 года ён памер у зняволенні[17].

Праз яе звароты бібліятэка ў Астраўцы не атрымала імя Адама Мальдзіса, як было запланавана. Бондарава назвала дзеяча «прапольскім калабарантам»[18].

Дзякуючы ёй са школьнай праграмы па літаратуры выключылі творы Артура Вольскага і Уладзіміра Ягоўдзіка.

Дабівалася зносу помніка Ларысе Геніюш у Зэльве на тэрыторыі царквы Святой Жываначальнай Тройцы. Пасля ён проста знік.

Імаверна, датычная знікненню памятнай шыльды ў гонар паўстанцаў 1863—1864 гадоў, у 1990-х гадах усталяванай на сцяне гродзенскага чыгуначнага вакзала[19].

Прымусіла гродзенскія ўлады прыбраць са спісу знакавых для горада персон на сайце гарадской бібліятэкі нацыянальных герояў Кастуся Каліноўскага і Тадэвуша Касцюшку.

Канфлікты з уладамі

У ліпені 2023 года заявіла, што кіраўнік упраўлення ўнутраных спраў Гродзенскага аблвыканкама Дзмітрый Разянкоў высунуў супраць яе галаслоўныя абвінавачанні і запатрабавала прад’явіць ёй афіцыйныя абвінавачанні[20].

«*Мне стала вядома пра тое, што вы асмеліліся распаўсюджваць пра мяне не адпаведныя рэчаіснасці звесткі, што нібыта я з'яўляюся „другім Ціханоўскім“ абражаю Ю. Х. Караева і У. С. Караніка, што праз такіх, як я, адбыўся дзяржпераварот*», — напісала Бондарава.

Праз тыдзень яна запісала відэа з выбачэннямі за свае словы[21].

«Спрыяе распальванню варожасці і нянавісці», — напісала яна ў заяве ў Генпракуратуру на дэпутата Ігара Марзалюка. Прычынай стаў выступ дэпутата на тэлеканале СТБ, дзе ён выказаўся за пазітыўную дыскрымінацыю беларускай мовы — своеасаблівыя льготы для беларускамоўных.

Шмат прэтэнзій да Бондаравай мае старшыня гродзенскай абласной арганізацыі «Белая Русь» Святлана Вараніца, якая абуралася, што на экскурсію ў Брэсцкую крэпасць прапагандыстка прыехала з «голай філейнай часткай»[3].

Вайна ва Украіне

З пачаткам поўнамаштабнага расійскага ўварвання ва Украіну Бондарава перайменавала канал з ужываннем лацінскіх літар Z і V, сімваламі падтрымкі расійскай агрэсіі, і ён называўся «БондареVa. BeZ купюр». Распаўсюджвала праз канал рэпосты расійскага прапагандысцкага кантэнту[1].

Крыніцы

1. Как гродненская контрабандистка стала самой известной доносчицей страны. Рассказываем историю Ольги Бондаревой (https://news.zerkalo.io/life/30515.html) (руск.). *Зеркало* (17 студзеня 2023). Праверана 18 жніўня 2023.
2. *HL*. Активистка “ИнфоСпецНаз” Ольга Бондарева взыскала с политзаключенного 1000 рублей за моральные страдания (https://hrodna.life/2021/07/02/bondareva-isk/) . *Hrodna.life* (2 ліпеня 2021). Праверана 18 жніўня 2023.
3. «Галоўная даносчыца Беларусі». Хто такая Вольга Бондарава, якая змагаецца з Геніюш, Марзалюком і «Хагі-Вагі» (https://www.svaboda.org/a/32382460.html) . *Радыё Свабода* (28 красавіка 2023). Праверана 18 жніўня 2023.
4. "Пацярпелыя выконвалі свой дзяржаўны доўг па зафарбоўванню незарэгістраванай сімволікі". Прысуд Васілю Пільцу (http://spring96.org/be/news/101879) . *spring96.org* (12 лютага 2021). Праверана 18 жніўня 2023.
5. *Ольга Бондарева* Вражеская пропаганда от Геббельса до наших дней // *Коммунист Беларуси*. — 21 мая 2021. — № 21 (1273) (http://www.comparty.by/sites/default/files/pdf-gezeta/kom_bel_21_1.pdf). — С. 5.
6. *Ольга Бондарева* Беларусь нуждается в законодательной защите от ЛГБТ-пропаганды // *Коммунист Беларуси,*. — 4 августа 2021. — № 31 (1387) (http://www.comparty.by/sites/default/files/pdf-gezeta/kom_bel_31_4.pdf). — С. 4.
7. *Плавинский Александр*. 21 апреля 2023 года в Минске прошел внеочередной XIV (XLVI) Съезд Коммунистической партии Беларуси | ВКонтакте (https://m.vk.com/wall-213241951_760). *m.vk.com*. Праверана 18 жніўня 2023.
8. Пад абцасам: як гарадзенская інфаспецназаўка стала гаспадыняй цэлага рэгіёну (https://belsat.eu/news/26-02-2023-pad-abtsasam-yak-garadzenskaya-infaspetsnazauka-stala-gaspadynyaj-tselaga-regiyonu). *belsat.eu*. Праверана 18 жніўня 2023.
9. Право имеют (https://t.me/nebovkletku/4). *Telegram*. Праверана 18 жніўня 2023.
10. Вадзім Плаўскі — Палітычныя вязні ў Беларусі (https://prisoners.spring96.org/be/person/vadzim-plauski). *prisoners.spring96.org*. Праверана 18 жніўня 2023.

11. Гном са сцяжком правёў адзіночны пікет на падваконніку. Цяпер яго ўладальніка судзяць (https://hrodna.life/articles/gnom-piket/) . *Hrodna.life* (18 жніўня 2023). Праверана 18 жніўня 2023.
12. У Беларусі забаранілі святкаваць Хэлоўін. Плануюць «культурнае імпартазамяшчэнне» (https://vk.com/@hrodna.like-u-belarus-zabaranl-svyatkavac-helon-planuuc-kulturnae-mparta) (руск.). *VK*. Праверана 18 жніўня 2023.
13. *vasia11*. Бондарава хоча сцерці памяць пра Каліноўскі і Касцюшку і ваюе з «Еўраоптам» (https://hrodna.life/2023/07/24/bondarava-evroopt/) . *Hrodna.life* (24 ліпеня 2023). Праверана 18 жніўня 2023.
14. *antonio*. Бондарава дамаглася, каб “Еўраопт” змяніў сваю рэкламу. Але на гэтым яна не спыняецца (абноўлена) (https://hrodna.life/2023/07/26/bondarava-rjeklama/) . *Hrodna.life* (26 ліпеня 2023). Праверана 18 жніўня 2023.
15. *K, A.*. У Гродне пачаўся суд над установай "Цэнтр гарадскога жыцця". Яе хочуць ліквідаваць (https://hrodna.life/2021/04/20/centr-likvidacija/) . *Hrodna.life* (20 красавіка 2021). Праверана 18 жніўня 2023.
16. Художника Алеся Пушкина приговорили к 5 годам лишения свободы (https://belsat.eu/ru/news/30-03-2022-hudozhnika-alesya-pushkina-prigovorili-k-5-godam-lisheniya-svobody). *belsat.eu*. Праверана 18 жніўня 2023.
17. В Беларуси умер художник и политзаключенный Алесь Пушкин – DW – 11.07.2023 (https://www.dw.com/ru/v-belarusi-umer-hudoznik-i-politzaklucennyj-ales-puskin/a-66194670) (руск.). *dw.com*. Праверана 18 жніўня 2023.
18. *Boradyn, Władysław*. Бібліятэка ў Астраўцы ня будзе насіць імя Адама Мальдзіса. Яго назвалі «прапольскім калабарантам» (https://wb24.org/be/2022/08/02/biblijateka-astracy-nja-budzje-nasic-imja-adama-maldzisa-jaho-nazvali-prapolskim-kalabarantam/) . *Wb24.org - Wirtualna Białoruś* (2 жніўня 2022). Праверана 18 жніўня 2023.
19. У Гродне знік памятны знак паўстанцам 1863 года - Беларуская Служба - polskieradio.pl (https://polskieradio.pl/396/7816/artykul/3211698,u-grodne-znik-pamatny-znak-paustancam-1863-goda) (нявызн.). *polskieradio.pl*. Праверана 18 жніўня 2023.
20. *antonio*. Бондарава ўступіла ў канфлікт з галоўным міліцыянтам Гродзеншчыны: кажа, што адчувае “іспанскі сорам” за сілавікоў (https://hrodna.life/2023/06/16/bondarava-razjankou/) . *Hrodna.life* (16 чэрвеня 2023). Праверана 18 жніўня 2023.
21. *vasia11*. Бондарава запісала "пакаяннае" відэа з самой сабой. Навошта? (https://hrodna.life/2023/06/21/bondareva-video/) . *Hrodna.life* (21 чэрвеня 2023). Праверана 18 жніўня 2023.

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Вольга_Славаміраўна_Бондарава&oldid=4589338"